3. логистика – поддерживает демонстрационные проекты, экологическое образование, исследования и мониторинг для решения местных, региональных, национальных и глобальных проблем в области охраны природы и устойчивого развития[2].

Важной особенностью биосферного резервата является возможность обоснования и демонстрации на этой территории подходов к устойчивому развитию на региональном уровне, опыт которых может быть распространен и адаптирован на мировой арене.

В Республике Беларусь функционирует трансграничный - трехсторонний биосферный резерват «Западное Полесье», который был образован путем заключения Соглашения между Правительством Республики Беларусь, Правительством Республики Польша и Правительством Украины.

Сотрудничество стран в рамках биосферного резервата «Западное Полесье основывается на принципах равенства, территориальной целостности государств, взаимной выгоды и добрососедства. Стороны способствуют сотрудничеству в области охраны и устойчивого использования биологического и ландшафтного разнообразия, содействуют сотрудничеству в области устойчивого развития указанного региона, сохранению традиционных знаний и образа жизни местных сообществ.

В силу соглашения подписанного между Республикой Беларусь, Украиной и Польшей разрабатывают и принимают планы управления соответствующими национальными биосферными резерватами в соответствии со своим национальным законодательством и координируют исполнение таких планов, способствуют сближению законодательства в области биологического и ландшафтного разнообразия. Стороны содействуют проведению совместных научных исследований, программ мониторинга окружающей среды, в первую очередь водно-болотных угодий, реагирующих на глобальное потепление климата, способствуют обмену информацией и наилучшим опытом в области охраны и устойчивого развития трансграничного биосферного резервата «Западное Полесье». Участники Соглашения «О создании трансграничного биосферного резервата «Западное Полесье»» проводят политику, направленную на повышение экологического сознания и обеспечение доступа общественности к информации по вопросам охраны и устойчивого развития трансграничного биосферного резервата «Западное Полесье». Данные государства координируют свои усилия по разработке и осуществлению программ и проектов по вопросам охраны и устойчивого развития трансграничного биосферного резервата «Западное Полесье», а также поиску соответствующих источников финансирования и технической поддержки, включая предоставляемые из международных организаций [3].

**Заключение.** Создание трансграничных особо охраняемых природных территорий позволяет установить международное сотрудничество между государствами и использовать взаимные способы для охраны и рационального использования данных территорий. Следует также внести понятие биосферного резервата в законодательство Республики Беларусь.

1. Об особо охраняемых природных территориях: Закон Респ. Беларусь от 20 окт. 1994 г. № 3335-XII(ред. от 09.01.2018) // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2018.
2. Рыбянец Н.М., Ивашкевич О.А. Биосферные резерваты ЮНЕСКО как модельные территории экологической устойчивости / Н.М. Рыбянец, О.А Ивашкевич права [Электронный ресурс] –Режим доступа: http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/103217/1/3-5.pdf. – Дата доступа: 09.07.2018.
3. О создании трансграничного биосферного резервата «Западное Полесье»: Соглашение между Правительством Республики Беларусь, Правительством Республики Польша и Правительством Украины // Консультант Плюс. Беларусь [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2018.

## ПРАЦЯГЛАЕ ВЫМАГАЛЬНІЦТВА

***Сілаеў С.А.,***
*старшы выкладчык КемДУ, г. Кемерава, Расійская Федэрацыя*
*Навуковы кіраўнік – Чарненка Т.Г., доктар юрыд. навук, прафесар*

Правільная кваліфікацыя злачынства з'яўляецца важнай гарантыяй рэалізацыі асноватворных прынцыпаў крымінальнага права (перш за ўсё – законнасці і справядлівасці) і захавання законных правоў як пацярпелага, так і вінаватага. Істотную ролю ў гэтым адыгрывае належнае прымяненне палажэнняў не толькі Асаблівай, але і Агульнай часткі крымінальнага



Рэпазіторый ВГУ

заканадаўства, у тым ліку тых, што датычаць размежавання паўторнасці (тоеснай рэальнай сукупнасці) злачынстваў і працяглага злачынства.

Мэтай працы з'яўляецца ўдакладненне крытэрыяў адзінства працяглага злачынства ў дачыненні да вымагальніцтва.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыяла для даследавання выкарыстоўваюцца дзеючае расійскае і беларускае крымінальнае заканадаўства, кіраўнічыя тлумачэнні Пленумаў Вярхоўных Судоў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, а таксама працы айчынных навукоўцаў-карністаў па адпаведнай тэматыцы. Даследаванне грунтуецца на юрыдыка-дагматычным метадзе з элементамі параўнальнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Упершыню ў савецкім крымінальным праве афіцыйнае азначэнне працяглага вымагальніцтва было дадзена ў п. 4 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда РСФСР ад 4 мая 1990 г. № 3 "Аб судовай практыцы па справах аб вымагальніцтве". "Не ўтвараюць паўторнасці, – гаварылася ў дадзеным дакуменце, – неаднаразовыя патрабаванні перадачы маёмасці або права на маёмасць, звернутыя да адной або некалькіх асобаў, калі гэтыя патрабаванні аб'яднаныя адзіным намерам і скіраваныя на завалоданне адной і той жа маёмасцю". Як відаць з прыведзенай цытаты, працяглае вымагальніцтва характарызуецца, па-першае, наяўнасцю шэрагу тоесных дзеянняў – патрабаванняў; па-другое, адзінствам прадмету; па-трэцяе, адзінствам намеру і мэты. Пры гэтым адзінства спосабу, на думку Пленума, не мае вырашальнага значэння (прынамсі, пра тое не гаворыцца), што здаецца нам слушным, паколькі ўжыванне розных па змесце пагроз з'яўляецца часцяком рэзультатам "незгаворлівасці" пацярпелага і не сведчыць аб множнасці намераў. Асабліва падкрэслена неістотнасць колькасці пацярпелых, што таксама цалкам натуральна: вымагальніцтва – гэта перш за ўсё маёмаснае злачынства, таму менавіта скіраванасць дзеянняў на адзін і той жа прадмет абумоўлівае іхняе ўнутранае адзінства; пэўную ролю адыгрывае і той факт, што прадметам вымагальніцтва можа быць маёмасць, якая належыць некалькім суўласнікам або юрыдычнай асобе, з прычыны чаго дамагчыся жаданага выніку вінаваты не можа без уплыву на некалькіх пацярпелых.

Цалкам ідэнтычная фармулёўка змяшчаецца ў п. 23 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 2001 г. № 15 "Аб прымяненні судамі крымінальнага заканадаўства па справах аб выкраданнях маёмасці", што сведчыць аб даволі цеснай узаемасувязі прававых сістэмаў Беларусі і Расіі, аб іх шмат у чым агульных дактрынальных асновах.

Але ж нельга не адзначыць пэўнай непаўнаты прыведзенага падыходу. У літаратуры шматкроць пісалася, што ў сучасных умовах вымагальніцтва можа набываць самыя розныя формы – ад эпізадычнага атрымання грошаў ад дробных гандляроў ці проста больш-менш заможных грамадзян да арганізацыі "дахаў", што займаюцца "абаронай" прадпрымальніцкіх структураў, рэгулярна спаганяючы з іх у выглядзе своеасаблівай "даніны" пэўны адсотак ад даходаў пацярпелых [1, с. 40-61; 4, с. 101-104; 5, с. 19-20; 6, с. 11]. З улікам гэткай крымінагеннай сітуацыі Пленум Вярхоўнага Суда Расійскай Федэрацыі дапоўніў сваю ранейшую пазіцыю па аналізаваным пытанні і ў п. 8 пастановы ад 17 снежня 2015 г. № 56 "Аб судовай практыцы па справах аб вымагальніцтве (арт. 163 КК РФ)" даў наступнае тлумачэнне: "Не ўтвараюць сукупнасці злачынстваў неаднаразовыя патрабаванні пад зазначанай у ч. 1 арт. 163 КК РФ пагрозай, звернутыя да адной або некалькіх асобаў, калі гэтыя патрабаванні аб'яднаныя адзіным намерам і скіраваныя на завалоданне адной і той жа маёмасцю або правам на маёмасць альбо на атрыманне матэрыяльнай выгады ад здзяйснення аднаго і таго ж дзеяння маёмаснага характару. Як адзінае злачынства належыць таксама кваліфікаваць патрабаванне, скіраванае на перыядычную перадачу пацярпелым маёмасці (напрыклад, штомесячную перадачу пэўнай грашовай сумы". Гэткае пашырэнне паняцця працяглага вымагальніцтва можна было б толькі вітаць, калі б яно не ўступала ў супярэчнасць з іншымі палажэннямі прыведзенай пастановы Пленума.

Як вядома, кожны з эпізодаў працяглага злачынства, разгледжаны ізалявана, утварае, як правіла, той самы асноўны склад злачынства, што і ўсе яны ў сваёй сукупнасці; інакш кажучы, аб'ектыўны бок адпаведнага складу злачынства праяўляецца ў кожным з "міні-злачынстваў". Але ў Расіі, у адрозненне ад Беларусі, дагэтуль пануе памылковае ўяўленне аб вымагальніцтве як аб карыслівым злачынстве, што не з'яўляецца выкраданнем [2, с. 237–257; 3, с. 332–353]. У адпаведнасці з гэткай трактоўкай юрыдычнай прыроды аналізаванага дэлікту ў п. 14 дзеючай пастановы Пленума аб вымагальніцтве падкрэслена, што дзеяннямі, якія ўваходзяць у яго аб'ектыўны бок, з'яўляюцца толькі выказванне патрабаванняў або пагрозаў ды прымяненне



Репозиторий ВГУ

гвалту; непасрэднае ж адабранне ў пацярпелага прадмету вымагальніцтва ды перадача яго выканаўцу лічацца дзеяннямі, што ляжаць па-за межамі гэтага складу, і, калі гаворка не ідзе аб арганізаванай групе, кваліфікуюцца як памаганне, а не як сувыкананне. Але, калі дзеянне не ўваходзіць у аб'ектыўны бок складу злачынства, яно не можа само па сабе ўтвараць эпізод працяглага злачынства. А адсюль выцякае, што крымінальна значымымі у выпадку вымагальніцтва з'яўляюцца толькі патрабаванні і пагрозы або гвалт, тады як непасрэднае ўзбагачэнне спраўцаў аказваецца нібыта "правамерным". Зразумела, гэта цалкам непрымальна, і судовая практыка да гэткіх высноваў не прыходзіць. У прыватнасці, Прэзідыум Вярхоўнага Суда Расійскай Федэрацыі у сваёй пастанове ад 1 лютага 2017 г. па справе № 186-П16 падкрэсліў, што тэрмін даўнасці за вымагальніцтва вылічваецца з таго моманту, калі была спыненая перадача грашовых сродкаў і патрабаванні аб іх выплаце не аднаўляліся, то-бок з апошняга плацяжу. Але, паўторымся, не могуць звязвацца прававыя наступствы злачынства з тымі дзеяннямі, што ляжаць па-за межамі ягонага складу.

Выйсцем з сітуацыі, на наш погляд, з'яўляецца прызнанне вымагальніцтва не "патрабаваннем пад пагрозай", не "карыслівым злачынствам, што прымыкае да выкраданняў", а выкраданнем, якое ўчыняецца шляхам патрабавання, падмацаванага пагрозай (гл. ч. 1 заўвагаў да главы 24 КК РБ). Гэта значыць, што адабранне маёмасці ўваходзіць у склад вымагальніцтва, нягледзячы на яго ўсечаную канструкцыю. Тады цалкам лагічным робіцца вылучэнне дзвюх разнавіднасцяў працяглага вымагальніцтва, прадугледжаных у кіраўнічым тлумачэнні Вярхоўнага Суда Расійскай Федэрацыі 2015 года.

**Заключэнне.** Такім чынам, працяглае вымагальніцтва можа існаваць як неаднаразовае патрабаванне адной і той жа маёмасці, падмацаванае тоеснымі або рознымі пагрозамі, і як атрыманне рэгулярных выплатаў без паўтарэння аднойчы выказаных патрабаванняў ды пагрозаў. У абодвух выпадках неабходнай прыкметай з'яўляецца адзінства намеру, немагчымае без адзінства прадмету злачынства.

1. Белоцерковский, С.Д. Рэкет в России / С.Д. Белоцерковский. – М.: Криминологическая Ассоциация, 2000. – 121 с.
2. Кочои, С.М. Ответственность за корыстные преступления против собственности: учеб.-практ. пособие / С.М. Кочои. – 2-е изд., доп. и перераб. – М.: АНТЭЯ 2000, 2000. – 288 с.
3. Лопашенко, Н.А. Посягательства на собственность / Н.А. Лопашенко. – М.: Норма: ИНФРА-М, 2012. – 528 с.
4. Сафонов, В.Н. Организованное вымогательство: уголовно-правовой и криминологический анализ / В.Н. Сафонов. – СПб.: СПбИВЭСЭП; О-во «Знание», 2000. – 239 с.
5. Уфалов, А.Г. Проблемы совершенствования уголовно-правового регулирования ответственности за вымогательство и шантаж: автореф. дис. ... канд. юрид. наук / А.Г. Уфалов. – Саратов, 2003. – 27 с.
6. Щербина, В.В. Ответственность за вымогательство: социально-правовые аспекты: автореф. дис. ... канд. юрид. наук / В.В. Щербина. – Ростов-на-Дону, 1999. – 23 с.

## АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ПРОТИВОПРАВНОГО ИСПОЛЬЗОВАНИЯ СЕТИ ИНТЕРНЕТ И ОСНОВНЫЕ НАПРАВЛЕНИЯ БОРЬБЫ С КИБЕР-ПРЕСТУПНОСТЬЮ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

***Смирнов П.В.,***
*студент 4 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Ивашкевич Е.Ф., канд. пед. наук, доцент*

В наше время большую роль в жизни государства, общества и личности играют информационные технологии и Глобальная сеть «Интернет», в которой лица вступают в различного рода общественные отношения. Данная сеть является простым, удобным и доступным способом передачи информации на любые, даже самые большие расстояния в кратчайшие сроки. Однако Интернет используется также и для осуществления противоправной деятельности.

Целью исследования является сравнительно-правовой анализ национального и зарубежного уголовного законодательства в сфере борьбы с преступностью в сфере высоких технологий.

**Материал и методы.** В качестве материалов были использованы Уголовный Кодекс Республики Беларусь, Уголовный Кодекс Российской Федерации, Конвенция Совета Европы о компьютерных преступлениях и др. При написании работы были использованы сравнительно-правовой метод и формально-юридические метод, метод комплексного исследования.

Репозиторий ВГУ